**Наско Э.В.,** *ст. выкладчык*

# НАРОДНАЯ ПЕСНЯ Ў ТВОРЧАСЦІ АНАТОЛЯ БАГАТЫРОВА

Імя А.В.Багатырова добра вядома ўсім, хто любіць і цэніць беларускую музыку. Песеннасць, меладызм сталі агульнымі стылёвымі прыметамі творчасці Багатырова, на інтанацыйны строй якой актыўнае ўздзеянне аказал народная песня, яе ладавыя рытмічныя асаблівасці, прынцып архітэктонікі. Кампазітар зрабіў 50 апрацовак народных песень. Многія з іх уваходзяць у рэпертуарны спіс як прафесійных харавых калектываў, так і самадзейных.

«Зорка Венера», «Люблю наш край», «Што то за хлопец, што за дзяўчына» - гэтыя апрацоўкі з'яўляюцца ўжо класікай беларус-кага харавога мастацтва.

Жыццяздольнасць названых і другіх апрацовак кампазітара не толькі ў іх яркай меладычнасці, але і ў вялікім майстэрстве Багатырова, яго беражлівым захаванні прыёмаў народнага шматгалосся, якія гарманічна спалучаюцца з прафесійнымі спосабамі выкладу музычнага матэрыялу.

Гарманічная мова не выходзіць за рамкі ладава-інтанацыйнай асновы той ці іншай народнай песні, што таксама садзейнічае раскрыццю вобраза ці сюжэта песні.

Любоўная песня «А ў гародзе верба расла» (запіс Э.Ледаховіча) прызначана для 4-галосага мяшанага хору з элементамі 5-галосся (divisi ў тэнараў, басоў) і двух салістаў (сапрана і тэнара).

Гарманічная мова апрацоўкі блізкая беларускім народна-песенным традыцыям, калі выкарыстоўваюцца акорды натуральных ладоў. Кампазітар пазбягае складаных, няўстойлівых акордаў, адчуваюцца натуральнасць, дыятанічная аснова твора. Мелодыя напеўная, у дыяпазоне актавы. Скачкападобны ўзыходзячы рух мелодыі кампенсуецца плаўным сыходным завяршэннем: працуе закон «меладычнай працівагі», што вельмі ўласціва для народнай мелодыкі. Зернем вакальнай мелодыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

служыць характэрны хваленадобны матыў з узыходзячым скачком да сексты. Адна з функцый такога запеву - ладавая «настройка», выяўленне тонікі ладавага нахілення.

Апрацоўка песні ўяўляе куплетна-варыяцыйную форму (7 куплетаў). Варыяцыйнасць праявілася ў шматграннасці фактурных змяненняў у кожным куплеце, а таксама ў разнастайнасці тэмбравых супастаўленняў, тэмбравых кантрастаў у правядзенні тэматычнага матэрыялу.

Тры сярэднія куплеты (4-6) напісаны ў танальнасці ля-мінор (пры асноўным мі-міноры). Гэтае наглыбленне ў плагальную сферу з'яўляецца як бы танальнай варыяцыяй і вельмі асвяжае ўсю апрацоўку. Такім чынам, увогуле атрымліваецца 3-частковая форма (А-А-А), дзе А - сярэдні эпізод у ля-міноры.

Кожны з 7-мі куплетаў - гэта перыяд непаўторнай будовы, які складаецца з трох сказаў (4т.- 3т.- 4т.). Усе сказы ў гэтым перыядзе яўна адрозніваюцца ад першапачатковага. Але пры гэтым захоўваецца некаторая інтана-цыйная еднасць, якая садзейнічае аб'яднанню ўсіх трох сказаў.

Харавы выклад ўсёй апрацоўкі вельмі зручны. Лініі харавых партый адзначаюцца гібкасцю меладычнага малюнка, багаццем дынамічных адценняў.

Кожная апрацоўка Багатырова - гэта закончаная карціна мастака-майстра з ярка выяўленым сюжэтам, дасканалай формай, цэльнай драматургіяй, дзе ёсць экспазіцыя, завязка, развіццё, кульмінацыя, развязка.

Мелодыя, меладычная лінія - галоўны канструктыўны элемент кампазітара. Яе гукавая аснова - гэта сучасная ладагарманічная мадальнасць. Акордыка складаецца амаль што выключна з трохгуччаў, рэдка з септакордаў, стварае часам функцыянальныя сувязі, пераважна плагальныя, але падпарадкоўваецца галоўнаму канструктыўнаму элементу - мелодыі.

Ва ўмовах змешанай мадальна-функцыянальнай сістэмы гармонія губляе формаўтваральную функцыю, за выключэннем, можа быць, кадансаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На першы план выступаюць дынамічныя і каларыстычныя ўласцівасці гармоніі, фанізм акордаў, што стала адной з тэндэнцый якаснага пераўтварэння гармоніі ў XX ст.

А.В.Багатыроў - нацыянальны мастак, без якога немагчыма ўявіць сучасную культуру нашай Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ